Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(73), 2012

*УДК 124.6:2–18*

# Лёс чалавека і яго праявы

А.Д. Паўлавец

Артыкул прысвечаны даследаванню лёсу чалавека і яго праяваў у культуры. Робіцца спроба сістэматызацыі гэтых праяваў на падставе разнастайных суаднесенасцяў чалавека.
**Ключавыя словы:** біялагічны лёс, боскае наканаванне, ідэнтычнасць, імя, калектыўны лёс, лёс, накід, самасны лёс, суаднесенасць.

The article is devoted to a man’s destiny and his manifestations in the culture. The author tries to organize these manifestations on the basis of different correlations of a person.
**Keywords:** biological destiny, divine plan, identification, name, collective destiny, destiny, sketch, own destiny, correlation.

У нашай прымардыяльнасці мы можам сфармаваць нейкую зыходную кропку нязменнасці. Яна супрацьстаіць усялякім спробам паўтарэння, перфарматыўнасці, артыкуляцыі. Гэта закон і накіраванасць функцыянавання нашага свядомага, тая кропка, якая ўтрымлівае нас і нашае існаванне. Тое, што можна ахарактарызаваць як волю альбо як быццё, альбо як лёс. Гэта сэнс, які стаіць за межамі нас саміх, з’яўляецца намі і адначасова не з’яўляецца. Ён затрымлівае свой надыход, даючы нам з’явіцца, і адначасова з’яўляецца нашым надыходам. Мы можам стварыць апісанне, прыпісаць яму нешта, але гэта прыпісанае не будзе ім. Таму вызначыць яе, гэтую кропку нязменнасці ў пастаяннай зменлівасці, было актуальнае раней і стала вельмі актуальна зараз. Лёс як нешта, што ўпарадкоўвае, што накіроўвае і структуруе. Цэнтр структуры альбо сістэмы, які абумоўлівае ўсю сістэму, выбудоўвае яго па вызначаных правілах, прычым, калі правілы мы здольныя апісаць, то лёс, які ёсць умова гэтых правілаў, іх крыніца, мы ўлавіць не здольныя. Гэта няўмольная логіка лёсу і сэнсу: ён паўсюль і нідзе. Мы ў ім, і ён у нас і адначасова па-за намі. Вымушаныя круціцца ў коле зменаў, вымушаныя пастаянна артыкуляваць, мы забываемся, што сама гэтая магчымасць кружэння ёсць магчымасць гэтай кропкі, гэтай нязменнасці. Тое, што кола ёсць толькі таму, што ёсць цэнтр. Цэнтр, які ўбірае ў сябе, цэнтр, які выводзіць з сябе і кружыць навокал сябе.

Такі характар лёсу, які ёсць і выніковая ўсіх магчымых уплываў, і адначасова ўсе ўзаемаўплывы, якія рэзультуюць у ім. Лёс разнастайны, паколькі ён умова гэтай разнастайнасці. Чалавек спрабуе сфарміраваць накід свайго нязменнага, у фармаванні свайго накіду сутыкаецца з тым, што няўмольна памыляецца, няўхільна ідзе супраць плыні ці, наадварот, “трапляе ў струмень” і здзяйсняе сваё наяўнае з дакладнасцю і мернасцю. Чалавек сутыкаецца са зменлівасцю і зыходзіць, забывае на свой лёс. Ён робіць крок ад таго, што нязменна, да сталага і зменлівага. Карта чалавека біта, ён прайграе сабе самому, забывае на тое, што ён вызначаны, як вызначаны ход зораў, узвышэнне і заняпад імперыяў і культураў. Ён тут таму, што ён тут быць павінен. І як бы мы не глядзелі на гэтае “павінен”: ці як на абмежаванне, ці як на бязмежнае, альбо як на перфарматыў, які прыводзіць нас і дае нам нас, лёс – гэта заўсёдны самадэтэрмінізм. Мы вызначаем: быць нам альбо не быць, ці спраўдзіцца тое нязменнае, тая кропка прымардыяльнага, ці мы забудзем на яе і будзем спраўджваць тое, што падмяняе нас.

Якраз наш накід вызначае і тое, якія мэты ў жыцці мы спрабуем рэалізаваць, яно абумоўлівае каштоўнасці, якія мы выбіраем (калі выбіраем іх ўвогуле). Патрэбна ўказаць на адрозненне накіда ад “праекта” Сартра: праект стварае існасць, накід жа не адмаўляе існасці, але ён ёсць спроба знайсці і вызначыць нязменнае ў сабе, вызначыць крыніцу гэтай існасці, тое, дзякуючы чаму толькі і магчыма разгарнуць нашую існасць і існаванне. Мы ведаем, што наш план шукае недасяжнага і адначасова з’яўляецца яго вынікам. Гэтае слізганне праекта ўздоўж паверхні, якая абарочваецца глыбінёю, нашаю глыбінёю, якая нам ніколі прынале-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

жыць не будзе. Але гэтая глыбіня праз сваю затрымку становіцца паверхняй, па якой рухаецца нашае жыццё, на якой мы малюем карункі нашага жыцця. Праз затрымку, адцягненне і прыход без прыходу, наяўнасць без наяўнасці, праз пісьмо да пісьма. Праз тое, што мы вымушаны пісаць па напісаным, якое мы нярэдка не разумеем і прачытаць не здольныя, дзякуючы гэтаму мы ёсць.

Лёс – гэта не толькі глядзенне іншых на мяне, гэта яшчэ і самаразгляд: не толькі іншы кажа мне пра мой лёс, але і я сам разглядаю жыццё, выношу меркаванне пра лёс. Лёс можна назваць суразгледжаным, паколькі ён узнікае на мяжы майго ўласнага досведу пра сябе і вопыту іншага чалавека пра мяне. Лёс у дадзеным аспекце – гэта самавідавочнае, самаўяленае ў маім жыцці і тым самым тое, што праходзіць міма мяне, паколькі відавочнае ўяўляецца як тое, што бачаць вочы, што не схаванае, ляжыць на відавоку, "і так зразумела". Хаця гэтая непрыкрытая, несхаваная відавочнасць хавае ў сабе маю магчымасць быць, якая адначасова адмяжоўвае мяне ад Іншага тым, што мой лёс можа быць толькі маім, яго немагчыма падзяліць з іншым, мой лёс дае мне цэльнасць і звязанасць. Іншы можа быць толькі ўплецены ў мой лёс. Аднак гэтае ўпляценне хутчэй нагадвае зварот, чым страту. Мы звяртаемся да Іншага нават, калі гэта маўклівы зварот. Гэты зварот – зварот паглядзець, разгледзець, увайсці і стаць. Паглядзець на мой лёс, разгледзець лёс у маім жыцці, а таксама ўбачыць, што Іншы свой лёс можна ўбачыць толькі праз мяне і мой лёс. А разгледзеўшы гэта, Іншы ўвойдзе і стане ў маім лёсе, а Я ўвайду і стану ў яго лёсе. Гэты ўзаемны рух магчымы толькі таму, што адцягваючая глыбіня лёсу не мае месца, таму яе месца можа быць паўсюль. Гэты ўзаемны рух магчымы таму, што прымардыяльная кропка ў ва мне, гэта шматкроп'е, якое знікае за далягляд мяне і патрабуе працягу. Увайсці і стаць – азначае прыйсці да працягу, дапоўніць, суаднесці, паставіць шматкроп'е, вызначыць месца, знайсці сваё месца. Толькі калі Іншы звернуты да майго лёсу, а я да яго, можна казаць пра месца, пра размяшчэнне і знаходжанне месца ў маім лёсе, у лёсе Іншага, якое ператвараецца ў акт, завяршае акт уваходу і звяршэння. Увайсці і стаць – набыць і здзейсніць.

Паколькі мы апынаемся на месцаразмяшчэнні/месцазнаходжанні, то адзінай нашай задачай робіцца самапазнаванне. Праз яго мы раскрываем сябе. Але самапазнаванне – гэта яшчэ і самавычарпанне, звядзенне на нішто свайго зместу, пераход у іншы стан, які інтэрпрэтуе папярэдні. Гэта азначае, што самапазнаванне – гэта не самапазнанне, гэта пазнанне крыніцы нашага месцаразмяшчэння/месцазнаходжання праз тое, якім спосабам мы рэалізуемся ў іх. Такім чынам лёс – гэта самапазнаванне, якое рухае, якое вяртае да крыніцы, якое знімае нас саміх. Самасціранне тоесна самапазнаванню. Чым болей чалавек пазнае сябе, тым больш ён здольны быць сабой. Ён экзісціруе, ён узрастае, стоячы ў быцці, якое яму не прыналежыць, але якое шчыльна звязана з ім самім. Лёс, які дае нам энергію і тое, што энергія дынамізуе ў нас. Лёс разгортваецца з нас у лёс Іншых, і лёс Іншых разгортваецца ў нас саміх. Мы глядзім на сябе і слізгаем да Іншага. Да таго, хто маўчыць у нашым лёсе, сказаўшы ўсё без слоў.

Каб убачыць лёс чалавека больш празрыста, мы павінны ўбачыць чалавека: ён надзелены такім анталагічным статусам, які трапна ахарактарызаваны ў вучэнні суфізму як барзах برزخ (перашэек). Чалавек уяўляе з сябе асяродак усяго свету праяўлення, адначасова чалавек з'яўляецца і адлюстраваннем Бога. Гэта памежнасць характарызуецца паняццем суаднесенасці, нісба نسبة. Але гэта такая суаднесенасць, якая ўказвае на адзіны Пачатак, на роднасць з Ім і праз Яго з іншымі, якія былі праяўленыя Ім, праз якую Ён усхвалены. Гэтым адрозны чалавек ад іншых істот. Вырашальнымі для лёсу чалавека становяцца наступныя суаднесенасці:

1) суаднесенасць чалавека і яго прыроднага пачатку;
2) суаднесенасць чалавека і яго самасці;
3) суаднесенасць чалавека і калектыву;
4) суаднесенасць чалавека і Бога.

Менавіта ў гэтых суаднесенасцях праяўляецца лёс чалавека, акурат гэтыя суаднесенасці ўплываюць на тое, што можна было б назваць чалавекам у часе. Кожная суаднесенасць можа быць разгледжана як адзінае, што ўплывае на чалавека ў часе, а можа – як сістэма, якая ўключае ў сябе і элементы, якія ад чалавека не залежаць і залежныя ад яго. Чалавек ў часе апісваецца як лёс, а значыць, кожная суаднесенасць спараджае свой лёс:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

1) біялагічны лёс;
2) самасны лёс;
3) калектыўны лёс;
4) боскае наканаванне.

Падобную спробу апісаць складнікі лёсу робіць В.Э. Чудноўскі. Такімі, з яго пункту гледжання, з'яўляюцца: планетарна-касмічны, біялагічны, сацыяльны [9].

**Біялагічны лёс.** Кожны чалавек нараджаецца ўжо з зададзенымі біялагічнымі параметрамі. Напрыклад, агульнай прыкметаю для ўсіх з'яўляеццца тое, што чалавек не здольны лятаць ці не валодае жабрамі. Відавое адрозненне чалавека ад птушак і іншых жывёл прадвызначанае і абмяжоўвае яго фізічныя магчымасці.

Нават працэс зачынання чалавека фізічна абумоўлены: нельга адназначна сказаць, што будзе дзяўчынка альбо хлопчык, але дакладна можна сказаць, што ёсць спалучэнне ХХ храмасомаў і ХУ храмасомаў, якія і накладваюць на чалавека знешнія прыкметы і абмежаванні фізічнага полу.

Звычайным і нармальным будзе сказаць, што біялагічная прадвызначанасць ніяк не можа паўплываць на лёс чалавека ў культуры, нават больш: культурны і біялагічны пачаткі ніяк не звязаны паміж сабою. Але чалавек, чыё здароўе слабое, не прызнаецца прыдатным да службы ў войску, кар'ера вайскоўца для яго закрыта, нават калі ён нарадзіўся ў сям'і, дзе ўсё мужчынскае пакаленне абараняла радзіму. Дрэнны зрок можа не дазволіць чалавеку кіраваць машынай, а наяўнасць псіхічных адхіленняў прыводзіць да таго, што праца псіхолагам для чалавека назаўсёды зачынена.

Калі ж успомніць, што той жа фактар біялагічнага полу цесна звязаны з фактарам культурнага полу, то можна канстатаваць, што першы з'яўляецца адным са складнікаў і падмуркаў калектыўнага лёсу. Мужчыну/жанчыну па біялагічных прыкметах не залічаць да жанчыны/мужчыны, і адносіны да яго будуць у межах тых чаканняў, якія сфарміравала культура да біялагічных прадстаўнікоў мужчынскага/жаночага полу.

Але не ўсе сучасныя даследчыкі, якія даследуюць біялагічны лёс, пагадзіліся з такім сцверджаннем. Так, прадстаўнікі нейрабіялогіі з'яўляюцца паслядоўнымі дэтэрміністамі, якія кладуць біялагічны лёс у аснову асноў, а астатнія паняткі, звязаныя з культурнаю роляю чалавека ("свабода волі", "свядомае"), з'яўляюцца неістотнымі і штучнымі, калі не бяруць свой пачатак у глыбінях нейрабіялагічага дэтэрмінізму. Генетычны дэтэрмінізм знаходзіць свае праявы ва ўсім: "Самцы чалавечага віду генетычна запраграмаваныя на палігамію, г. зн. нявернасць юрыдычнай жонцы. <…> Жанчын фізічна цягне да мужчын-славутасцяў, бо яны – жанчыны – генетычна запраграмаваныя адчуваць, што першыя сярод лепшых змогуць лепш паклапаціцца пра нашчадкаў. <…> Дзяўчынкі-падлеткі генетычна запраграмаваныя спаць абы з кім. <…> Большасць забойстваў таксама з'яўляецца вынікам генетычна запраграмаванай неадольнай цягі" [3, с. 107]. Вяршыняй дэтэрмінізму з'яўляецца вера некаторых нейрабіёлагаў у тое, што пры наяўнасці камп'ютэраў адпаведнай моцы і складанасці было б магчыма "прадказаць усё жыццё любой чалавечай істоты, момант за момантам" [3, с. 107].

**Самасны лёс.** Акрамя фізічных асаблівасцяў, чалавек набывае самасныя асаблівасці, менавіта на іх грунтуецца класічнае ўяўленне пра індывідуальнасць асобы, пра яе адрознасць ад іншых. Пачынаецца ўсё з імя. Спіс іх хаця і абмежаваны, аднак менавіта з ім звязана нашае самаснае аддзяленне ад іншых, хаця называць гэта прадвызначэннем ў плане Боскага прадвызначэння даволі складана, аднак яно іграе сваю адмысловую ролю. Дастаткова паглядзець, наколькі цесна звязана характарыстыка долі чалавека і імя ў межах культуры. Якая вялікая колькасць табу звязана з імем чалавека [8, с. 261–279]. А колькі тлумачэнняў супадзення імя і характару чалавека. Так, П.А. Фларэнскі піша: «Собственное имя, внутренний концентр прочих имен, и выразим одним словом, и охватывает полный круг энергий личности» [7, с. 448]. Чалавек, які страчвае самасць, у першую чаргу губляе імя як прыкмету індывідуальнасці і набывае такую якасць, як безасабовасць да любых імёнаў, якія яму надаюць іншыя. Пры гэтым ён зліваецца з Першаснай крыніцаю, а значыць, і перастае залежыць ад індывідуальных праяваў лёсу. Імя каментуе ўсё жыццё чалавека сваёй наяўнасцю і тым, як ён праяўляецца.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Менавіта імя – здольнасць даваць імёны і прымаць імёны – робіць чалавека падобным да Бога. Ён здольны спалучаць у сваім жэсце веру і веды, магутнасць перформансу, права на “гэта”, права пераводзіць з ня існага ў існае, права ўвасаблення. Чалавек – гэта ўсеахопны канспект імёнаў Бога, што адкрывае яму магчымасць спазнання сусвету і Бога, паколькі ён ў стане адкрываць ў самім сабе, у вопыце пра самога сябе свет і Бога.

Праява ў імя чалавека (стварэння). Чалавек без імя не мае інструмента, як для спазнання Бога ў свеце, так і для спазнання света. Іншая справа, што даванне імёнаў створанаму свету падобнае да спляцення павуціны ілюзій, паколькі апошняе ператварае свет з цэласна ўспрымальнай праявы Абсалютнага Быцця ў свет дыферэнцыяваны і строга размечаны, і вызначанай рэчаіснасці. Гэта сімвалічны акт другога стварэння, калі вобразы набываюць абстрактнае значэнне, а Рэчаіснасць – акрэсленыя рысы, і ўвасабляецца як запісанае чалавекам, а пасля – прамоўленае Імя. Страціўшы здольнасць да называння, чалавек губляе магчымасць спазнання самога сябе і навакольнага свету.

Імя (з вялікай літары) адрознівае свайго носьбіта ад усіх астатніх людзей, асабліва ў яго ўласным самасвядомым. Уласныя імёны першымі засвойваюцца дзіцём і апошнімі страчваюцца пры растройствах маўлення. У той жа час імёны функцыянуюць як вызначаныя сацыяльныя знакі, што ўказваюць на паходжанне, сямейнае становішча, сацыяльны статус і многія іншыя якасці сваіх носьбітаў [4, с. 43].

Налімаў адзначае, што імя (з вялікай літары) псіхалагічна адносіцца да “далагічнага”, вобразнага слоя двумання. Успрыманне імя – свайго рода пазванне. «Человек, услышавший имя, должен был его узнать, “читая” внутри себя… Над именем не производится логических операций, просто происходит внутреннее сосредоточение над ним, его узнавание в процессе медитации над ним. Имя стоит вне логики – о том, что стоит за именем, нельзя узнать из сопоставления слова-имени с другими словами, ибо с именем связано именно то, что органически присуще только ему одному… Имена не передают чего-то от одного лица к другому, а служат только ключом для включения механизма воспроизведения чего-то внутри нас» [5, с. 204, 208].

Акрамя ўсяго, ёсць яшчэ шмат індывідуальных характарыстык, якія можна аднесці да тэрміну тунель рэчаіснасці альбо, як некаторыя яе называюць, да мапы рэчаіснасці. Наш індывідуальны спосаб арганізацыі інфармацыі, што паступае да нас з асяродку, а таксама тое, як мы падаем інфармацыю асяродку, калі сказаць некалькімі словамі, то гэта наш тунель рэчаіснасці. Фармаванне яе далёка не выпадковасць, і хаця нярэдка гэтая сістэма змяняецца, асноўныя яе пабудовы застаюцца нязменнымі на працягу ўсяго жыцця. Такое прадвызначэнне таксама магчыма аднесці не столькі да Боскага, а хутчэй да культурнага абумоўлення, таму што некаторыя рэчы звязаны з нашымі карэннымі характарыстыкамі і тым больш з фізічнымі. Тып тэмпераменту чалавека залежыць, па адной з версій, ад тыпу нервовай сістэмы чалавека, і адначасова на знешнім выглядзе адбіваецца тэмперамент. Так, успрыманне большасці людзей і базавыя каштоўнасці фарміруюцца на абумоўленай стадыіі люстэрка, калі верыць Ж. Лакану, гэтая стадыя запраграмавана і непазбежна. Згодна ж з К.Г. Юнгам, чалавечы тэмперамент закладваецца ўвогуле ў межах спалучэння архетыпічных уяўленняў, а чалавечае эга – толькі комплекс і не больш. З тэалагічнага ж пункту гледжання, жыццё чалавека абумоўлена тым, што ён нараджаецца са “спадчынай Адама” – першародным грахом.

**Калектыўны лёс.** Такім чынам можна ўбачыць, што біялагічнае і самаснае прадвызначэнне цесна пераплеценыя і складваюць падмурак адзінай з’явы – такой, як прадвызначэнне культурай.

Чалавек, які прыходзіць у наш свет, адразу ж апынаецца ў культурным асяродку. Незалежна ад таго, у якой культуры ён нарадзіўся (ці то ва ўсходняй, дзе месца яму прымеркавана, ці то ў заходняй, дзе чалавек свабодны ў выбары месца), ён у рэшце рэшт займае месца паміж людзьмі. Гэта адразу ж прыводзіць да таго, што людзі пачынаюць глядзець на яго і ацэньваць яго лёс. Своеасаблівая эстэтыка, кожнае месца прывязвае чалавека.

Чалавек апынаецца пад поглядамі іншых людзей. Яны пачынаюць глядзець на яго, ацэньваць яго лёс. Чалавек валодае добрым альбо дрэнным лёсам. Гэтае вызначэнне залежыць ад таго, што можа быць, якія набыткі бачныя наяве. Паспяховая/няўдалая кар’ера, моц-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

нае/слабое здароўе, добры/дрэнны фінансавы стан і яшчэ вялікая колькасць прыкметаў, па якіх ацэньваюць калектыўны лёс чалавека. Гэта знешні чалавек. Наяўнасць знешніх элементаў вымушае чалавека ператварыцца ў статычную фігуру, якая ў той ці іншай ступені спалучае ў сабе сталыя для пэўнай культуры сімвалы паспяховасці/няўдаласці лёсу. З пункту гледжання калектыву ён сам ператвараецца ў сімвал – сімвал добрага/дрэннага лёсу.

Ключавым для лёсу чалавека аказваецца адказнасць. Яна пранікае ў свабоду і адказнасць. Здольнасць даць адпаведны адказ на погляд Іншага, на чалавека, які разглядае мяне і чакае ад мяне прадказанага дзеяння. Але гэта не проста адказнасць, яна звязваецца з усведамленнем дзеяння, разгортвае лёс у свабоду праз адказнасць і ўсвядомленасць. Самасны і надындывідуальны лёс праяўляе сябе толькі ў адказнасці і ўсвядомленасці. Любое дзеянне з’яўляецца лёсавызначальным настолькі, наколькі яно задае чалавека і задаецца чалавекам.

Свабода ў чалавечай рэчаіснасці не больш чым лёс. Гэта не азначае, што свабода рэдуцыруецца да лёсу і больш ніяк сябе не праяўляе. Наадварот, Лёс і свабода – адзіная сістэма. Але ж гэта не азначае таго, што чалавек асуджаны на свабоду, што свабода з’яўляецца лёсам чалавека. Не. Гэта паказвае на тое, што свабода не адна. Свабоды розняцца адна ад адной, маюць мноства ступеней і якасцей, пранізваюць усе спосабы і формы чалавечага існавання. Свабода арганізуе і праяўляе сваё нутраное становішча – месцаразмяшчэнне і месцазнаходжанне. З іншага боку, свабода – гэта адказнасць. Такім чынам, сістэма адказнасць-свабода-лёс – гэта сістэма, ў якой чалавек знаходзіцца ў разгубленасці, і немагчыма вызначыць, ці быў ўчынак вольным ці быў наканаваны.

Сучаснае думаннее ўзводзіць пытанне калектыўнага лёсу чалавека і ператварае яго ў лёс толькі калектыўны. Чалавек, як вынік дыскурсіўнай прасторы сімвалічных і палітычных шэрагаў, не можа ўяўляць цэласнай сістэмы, завершанага цэлага. Тэкст альбо паглынае яго, як гэта піша Барт у сваёй аўтабіяграфіі “Ралан Барт пра Ралана Барта”, і наступае: “время повествования (галереи образов) заканчивается вместе с юностью субъекта: биография бывает только у непроизводительной жизни. Как только я начинаю производить, писать, то сам Текст и лишает меня (к счастью) повествовательной длительности. Он, Текст, не может ничего рассказывать; он увлекает мое тело далеко прочь от моей воображаемой личности, к какому-то беспамятному языку, который является уже языком Народа, внесубъектной массы” [2, с. 10].

Індывідуалізацыя робіцца асноўным працэсам утварэння чалавека і яго лёсу. Узнікае на мяжы шэрагаў эквіваленцыіі пры атаясамленні сябе з нейкімі дыскурсамі, з нейкімі гуртамі, якія таксама носяць характар сімвалічнага. Чалавек і яго лёс робіцца закладнікам калектыву, але гэты калектыў не мае матэрыяльнага ўвасаблення, паколькі ён поўнасцю пераведзены ў стан сімвалічнага. Такі лёс – гэта выпадковы вынік свядомай ці несвядомай артыкуляцыі сябе як часткі агульнага дыскурсіўнага шэрагу. На месца чалавека прыходзяць Людзі, на месца чалавека прыходзіць Індывід. Чалавецтва ператвараецца ў Нішто, якое існуе толькі як знакавы асяродак. Лёсам такога асяродка робіцца нараджэнне знакаў і новых сімвалаў, а таксама абмен імі. Калі абмен будзе парушаны, а знакі вырабляцца больш не будуць, то застанецца толькі Нішто.

**Боскае наканаванне.** Зусім іншая справа, калі мая суаднесенасць з Богам уваходзіць і ўступае ў свае правы. Праблема ўстае даволі востра. Ці можна казаць пра “лёс”, калі ёсць Бог. Ці магчымы лёс, калі ёсць наканаванне. Устае пытанне пра тое, што людзі з прадвызначэннем не маюць лёсу. Хаця і прадвызначэнне і лёс адносяцца да дэтэрмінісцкай канцэпцыі, аднак ні прадвызначэнне ні лёс не выключаюць адзін аднаго. Гэтая праблема сур’ёзна абмяркоўваецца менавіта ў арабскай філасофіі, тут робіцца спроба сінтэзу дэтэрмінізму і індэтэрмінізму, а разам спроба зынтэграваць Боскае і чалавечае праз сінтэз прадвызначэння і лёсу. Так, у сваім трактаце “Зубдат ал-хакаік” Азіз Ад-Дзін Ібн Мухаммад Насафі кажа пра адрознасць некаторых паняткаў. Ён выдзяляе і аддзяляе наступныя рэчы:

- “промысл (*кадар)* Истинного”, які ён вызначае наступным чынам: “вращение же того, что создал”, ён з’яўляецца “деянием Господа в этом мире”;
- “повеление *(хукм)* Господа” , “знание Его, которое предвечно”;
- “предопределение *(каза)* Господа” , “сотворение Им того, что знал” [6, с. 50].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ібн Аль-Арабі праводзіць раздзел паміж лёсам і прадвызначэннем. Апошняе ён вызначае як “суждение (хукм) Божье о вещах, а судит Бог о вещах соответствено тому, как знает Он их и о них, а знает Бог вещи так, как то дано самими познаваемыми, каковы они суть”. Лёс жа ён вызначае як “временное осуществление (тавкит) вещей такими, какие они в воплощенности своей, и не более того” [1].

Такім чынам, лёс – гэта праява касмічнага працэсу ў межах аднаго жыцця, якое знаходзіцца ў прамым падпарадкаванні касмічнаму працэсу, які ён жа сам і абумоўлівае.

Тут мой лёс – гэта тое, што вызначае Бог сваёй воляю, таму мая аўтаномія цалкам і поўнасцю вызначаецца воляю Бога. Усе мы, у тым ліку і Іншы, суаднесеныя з Богам, таму наша лучнасць, наша множная Адзінкавасць – гэта эманацыя, якая замацоўвае за намі тую альбо іншую сітуацыю, месцаразмяшчэнне ці месцазнаходжанне. Мы замацаваны ў іерархічнай структуры свету, якая спалучае нутраное і знешняе, пераразмяркоўвае эманацыі неабходным чынам, але калі яна пераходзіць ў свет увасобленасцей, то можа ўвасабляцца ці не рэалізоўвацца, паколькі выбар застаецца ў руках чалавека.

## Літаратура

1. Ибн ал-Араби, ад-Дин Муйи. Гемма мудрости о судьбе в слове Ездры / Муйи ад-Дин ибн ал-Араби // Геммы мудрости. – Режим доступа : http://smirnov.iph.ras.ru/win/publictn/bezels/g14.htm. – Дата доступа : 09.02.2012.

2. Барт, Р. Ролан Барт о Ролане Барте / Р. Барт. – М. : Ad marginem, Сталкер, 2002. – 288 с.

3. Вулф, Т. Даруйце, але ваша душа сканала / Т. Вулф // ARCHE-пачатак. – 2004. – № 2. – С. 101–115.

4. Кон, И.С. В поисках себя: личность и ее самосознание / И.С. Кон. – М. : Политиздат, 1984. – 335 с.

5. Налимов, В.В. Вероятностная модель языка / В.В. Налимов. – М. : Наука, 1979. – С. 304.

6. Насафи, Ад-Дин Азиз. Зубдат ал-хакаик / Азиз Ад-Дин Насафи // Суфизм в контексте мусульманской культуры. – М., 1989. – С. 38–79.

7. Флоренский, П.А. Имена / П.А. Флоренский // Имена : сочинения. – М., 2006. – С. 433–650.

8. Фрэзер, Дж.Дж. Золотая ветвь / Дж.Дж. Фрэзер. – М. : АСТ, 1998. – 784 с.

9. Чудновский, В.Э. Смысл жизни и судьба человека / В.Э. Чудновский // Общественные науки и современность. – 1998. – № 1. – С. 175–183.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 29.02.12

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины